**З**воніць няхай так срэбна
**І** абуджае ранне
**М**ілая птаха ў небе,
**У** аквамарыне світальным [1, с. 82].

Можна бясконца згадваць славутых прадстаўнікоў Валожыншчыны, якія стварылі своеасаблівы малітоўнік гэтага рэгіёну, але мы ў сваім артыкуле імкнуліся звярнуць увагу на асобныя, невядомыя шырокаму колу чытачоў старонкі літаратуры.

**Бібліяграфічны спіс:**


1. Гіруць-Русакевіч, В. Ф. Мовай сэрца : кніга паэзіі / В. Ф. Гіруць-Русакевіч.– Мінск : Маст. літ., 2008. – 158 с.
2. Курыла, М. Асенні рэнесан : вершы. – ЛМФ «Нёман», 2001. – 88 с.
3. Равінскі, Г. А. Млын жыцця // Г. А. Равінскі. – Мінск : Рым.-катал. парафія Св. Сымона і Св. Алены, 2004. – 396 с.


## ЖЛОБІНШЧЫНА ПРАВАСЛАЎНАЯ: ЛЯ ВЫТОКАЎ СТАНАЎЛЕННЯ


***В. Э. Літаш***
*УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», г. Мінск*

*Навуковы кіраўнік – І. М. Мішчанчук, кандыдат філалагічных навук, дацэнт*



**Анатацыя.** У артыкуле разглядаюцца асноўныя этапы станаўлення праваслаўя Жлобінскага раёну, апісваюцца знаходкі і артэфакты старажытных Радзімічаў канца I – пачатку II тысячагоддзя нашага тысячагоддзя.



**Ключавыя словы:** радзімічы; Хрышчэнне; праваслаўе; курганы; краязнаўства.


Прывіваць любоў маладога пакалення да свайго народа трэба перш за ўсё з вывучэння гісторыі, культуры і літаратуры малой радзімы – горада ці вёскі, у дадзеным выпадку краязнаўства ў шырокім і вузкім сэнсе становіцца ланцужком, што звязвае тры часавыя вымярэнні: мінулае – сучаснасць – будучыню.

На заранку чалавецтва тэрыторыя маёй малой радзімы ўяўляла сабой дзікі, пакрыты дрымучымі лясамі і непраходнымі балотамі край, жыхары якога

займаліся земляробствам, жывёлагадоўляй, паляваннем і рыбалоўствам. Іх духоўнае жыццё было цалкам падпарадкавана паганству.

У канцы X стагоддзя ўсходнія славяне яшчэ да Уладзіміра пачалі прымаць хрысціянскую веру, бо мелі цесныя культурныя і гандлёвыя сувязі з Візантыяй. Лічыцца, што землі нашых продкаў благаславіў вучань Ісуса Хрыста – апостал Андрэй Першазваны: пасля цудадзейных падзей дня Пяцідзясятніцы ў Іерусаліме [Дзеі апосталаў, гл. 2], ён накіраваўся прапаведаваць Слова Божае ў Прычарнамор’е – Скіфію, дзе яго ўвагу прыцягнуў Днепр і яго наваколле, багатае на лясы, пушчы, звяроў і птушак. Аповед пра гэтае падарожжа можна знайсці ў «Аповесці мінулых гадоў»: «Калі Андрэй вучыў у Сінопе і прыбыў у Корсунь, даведаўся ён, што недалёка ад Корсуні вусце Дняпра, і захацеў адправіцца ў Рым, і праплыў у вусце Дняпроўскае, і адтуль адправіўся ўверх па Дняпры...» [1]. Гэта значыць, што апостал праплываў і праз тэрыторыю цяперашняга Жлобінскага раёна, бо «сваім з’яўленнем Жлобін абавязаны знакамітаму гандлёваму шляху з варагаў у грэкі» [4, с. 47].

Нельга дакладна сказаць, калі менавіта ў нашай мясцовасці пачалася актыўная пропаведзь хрысціянства, але дакладна вядома, што яшчэ задоўга да афіцыйнага прыняцця Руссю хрысціянства (988-990 гг.) ужо існавалі хрысціянскія абшчыны. Хрысціцель Русі – вялікі князь Уладзімір – адрозніваўся настойлівасцю ў справе распаўсюджвання хрысціянства. Рабіў ён гэта пры ўсякім зручным выпадку, у тым ліку і падчас сваіх плаванняў па Дняпры. Да таго часу (канец X ст.) плямёны радзімічаў і дрыгавічоў, якія пражывалі на тэрыторыі сучаснай Жлобіншчыны, знаходзіліся ў складзе адзінай Кіеўскай Русі, а Днепр злучаў найважнейшыя эканамічныя і палітычныя цэнтры гэтай дзяржавы – Кіеў і Вялікі Ноўгарад. Так, у пачатку XX ст. аўтары гісторыка-статыстычнага апісання Магілёўскай епархіі, у склад якой тады ўваходзіла і большая частка прыходаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі сучаснай Жлобіншчыны, пісалі: «...св. Уладзімір – вось першы і найгалоўнейшы дзеяч на ніве Хрыстовай у Магілёўскім краі» [3, с. 384–385].

Амаль па ўсёй тэрыторыі Жлобінскага раёна раскіданы старажытныя пахаванні людзей – курганныя могільнікі, кожны з гэтых помнікаў археалогіі па-свойму ўнікальны, але ў нашым выпадку цікавасць уяўляюць толькі два з іх – каля вёскі Дзяніскавічы Майскага сельскага савета і вёскі Курганне Краснабярэжскага сельскага савета. Тут у 70-х гг. XX ст. археолагам на чале з гомельскім навукоўцам Уладзімірам Багамольнікавым (1941–1992) удалося выявіць нацельныя металічныя крыжыкі-энкалпіёны, якія адносяцца да мяжы IX-XII стст., пра што аўтар апісаў у сваёй працы.

У вёсцы Дзяніскавічы Майскага сельскага савета знаходзіцца 31 курганны могільнік, вышыня кожнага з якіх да двух метраў, а дыяметр – 10-12 метраў; тут былі знойдзены парэшткі людзей, аскепкі керамікі, ганчарныя гаршкі, іншыя прадметы, а таксама адзін са згаданых вышэй нацельных крыжыкаў: «бронзавы

крыжык з выявай распяцця на адным баку (мяркуючы па прыліплай да яго вушы пацеркі, і абрыўку, які злучае ніткі, гэты крыжык насіўся ў складзе караляў)» [2, с. 415].

У вёсцы Курганне таксама быў знойдзены нацельны крыжык, які сведчыць, што нашы продкі радзімічы, якія пражывалі на тэрыторыі Жлобіншчыны, хавалі сваіх продкаў па-хрысціянску яшчэ да шырокага распаўсюджання праваслаўя.

Такім чынам, пачатак распаўсюджвання Слова Божага на беларускіх землях, які звязаны з апосталам Андрэем (легенда гэта ці праўда дакладна не высветлена да нашага часу), прыходзіўся на ранейшы за афіцыйны час Хрышчэння Русі.

**Бібліяграфічны спіс:**

1. Аповесць мінулых гадоў [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://azbyka.ru/otechnik/Nestor_Letopisets/povest-vremennyh-let/. – Дата доступу: 10.04.2023.

2. Археологические открытия 1975 года : сб. статей / АН СССР, Ин. археологии ; отв. ред. Б. А. Рыбаков. – М. : Наука, 1976 г. – 604 с.

3. Новосельцев, А. П. Древнерусское государство и его международное значение / П. Новосельцев [и др.]. – М. : Наука, 1965 г. – 476 с.

4. Прошин, Г. Как была крещена Русь / Г. Прошин [и др.]. – М. : Полит. издат, 1989 г. – 320 с.

## АДМЕТНАСЦЬ ЖАНОЧАГА ВОБРАЗА Ў ТВОРЧАСЦІ У. КАРАТКЕВІЧА

***У. А. Ралько***

*УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», г. Мінск*

*Навуковы кіраўнік – Т. М. Тарасава, доктар філалагічных навук, прафесар*

**Анатацыя.** У артыкуле вылучаюцца характэрныя рысы жаночага вобраза ў творчасці Уладзіміра Караткевіча. Акрэсліваецца, якім чынам жаночыя вобразы, неабавязкова галоўныя, уплываюць на разгортванне рамантычнага сюжэта, падкрэсліваецца адметнае. Адлюстроўваецца значэнне караткевічаўскага вобраза жанчыны ў беларускай літаратуры.

**Ключавыя словы:** У. Караткевіч; вобраз жанчыны; адметнасць.